## Да этнічных працэсаў на Панямонні ў раннім сярэднявеччы

На старонках „Białoruskich Zeszytów Historycznych” этнічным кантактам на Панямонні ўдзялялася дастаткова ўвагі. Артыкулы Аляксандра Краўцэвіча тычыліся генезісу Вялікага княства Літоўскага і звязаным з ім працэсам балта-славянскага ўзаемадзеяння[1]. Даследчык, спалучыўшы археалагічныя, гістарычныя, лінгвістычныя і іншыя крыніцы, паспрабаваў высветліць узаемасувязь балта-славянскіх кантактаў і працэсу фармавання ВКЛ. Згаджаючыся па сутнасці з большасцю высноў А. Краўцэвіча, мы хацелі б выказаць некаторыя свае меркаванні па гэтай праблеме. Аўтар на працягу апошніх дзесяці гадоў займаецца вывучэннем археалагічных помнікаў X-XIII ст.ст. на тэрыторыі Панямоння. Таму этнічныя кантакты да ўзнікнення ВКЛ (эвалюцыя балта-славянскай мяжы і характар узаемаадносін) мы разглядаем па падставе археалагічных крыніц. На наш погляд, у артыкулах А. Краўцэвіча якраз бракуе крытычнага аналізу археалагічных матэрыялаў. Пры гэтым мы ўсведамляем, што яны (археалагічныя крыніцы) не могуць выступаць у якасці адзінага аб’ектыўнага аргумента ў вырашэнні дыскусійнай праблемы.

У гісторыі няма народаў, якія з’явіліся без змешвання розных этнасаў. Дастаткова ўзгадаць, напрыклад, французаў, якія з’явіліся ў выніку кантактаў кельтаў, рымлян, германцаў. Ці англічан — працэс змешвання кельтаў, рымлян, англаў і саксаў. Беларускі народ

[1] А. Краўцэвіч, *Да праблемы ўтварэння Вялікага княства Літоўскага,* „Białoruskie Zeszyty Historyczne” 1996, nr 1, s. 5-22; ён жа, *Працэс балта-славянскіх кантактаў на Панямонні і ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага,* „Białoruskie Zeszyty Historyczne” 1998, nr 9, s. 5-25.

паўстаў у выніку рассялення славян на тэрыторыі пражывання балтаў і іх змешвання. Гэта прызнана большасцю археолагаў і спецыялістаў іншых навук — антраполагаў, этнолагаў, мовазнаўцаў[2]. Таму тэзіс аб тым, што шматвяковыя міжэтнічныя кантакты на Панямонні сталі часткай этнагенезу беларусаў, ёсць агульнапрыняты і пярэчанняў не выклікае. Перад даследчыкамі стаіць пытанне: калі ж славяне прыйшлі на Панямонне? Услед за Ф. Гурэвіч А. Краўцэвіч паўтарае, што славянскія паселішчы з'явіліся ў басейне Нёмана у другой палове I тысячагоддзя н.э. Сама Ф. Гурэвіч прыводзіла ў якасці доказу „паселішчы, а таксама такія характэрныя помнікі, як падоўжаныя і доўгія курганы"[3]. Але тут ёсць моманты, на якія трэба звярнуць увагу.

Генезіс доўгіх курганоў і іх этнічная інтэрпрэтацыя — найбольш складаныя праблемы пры вывучэнні помнікаў культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў. Адны з даследчыкаў разглядаюць гэтыя помнікі як славянскія, звязваючы іх з крывічамі (П. Траццякоў, С. Тараканава, В. Сядоў, Я. Носаў, Г. Штыхаў). Частка прыбалтыйскіх даследчыкаў з'яўленне доўгіх курганоў у Эстоніі і Латвіі звязваюць таксама з распаўсюджваннем славянскага этнічнага элемента (М. Шмідэхельм, Э. Шнорэ). Да прыбалтыйска-фінскага насельніцтва адносяць доўгія курганы С. Лаул, С. Бялецкі. Пра неславянскасць культуры доўгіх курганоў трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н.э. аргументавана пісалі І. Ляпушкін, М. Артамонаў, Э. Загарульскі, В. Булкін, А. Мядзведзеў і іншыя, лічачы гэтую культуру балцкай. Да рознаэтнічнага насельніцтва (балта-славянскага) адносяць культуру доўгіх курганоў Я. Шмідт, У. Янукоў, В. Шадыра[4]. Аднак у нашым выпадку этнічная інтэрпрэтацыя не галоўнае. На тэрыторыі Панямоння гэтай катэгорыі помнікаў няма. Рэч у тым, што за доўгія курганы Ф. Гурэвіч палічыла пясчаныя дзюны натуральнага паходжання. Высвятлілася гэта яшчэ ў канцы 60-х гадоў падчас даследаванняў на Панямонні В. Сядова[5].

А. Мядзведзеў сцвярджае, што развіццё насельніцтва Беларусі (у тым ліку і Панямоння) да IX ст. н.э. трэба разглядаць як развіццё культур, што ў этнічных адносінах належалі да ўсходніх балтаў (культура штрыхаванай керамікі, днепра-дзвінская, мілаградская, банца-

[2] Л. Дучыц, *Балты і славяне на тэрыторыі Беларусі ў пачатку II тысячагоддзя*, „Беларускі гістарычны агляд" 1995, т. 2, сш. 1, с. 15-30.

[3] Ф. Д. Гуревич, *Древности Белорусского Понеманья*, Москва—Ленінград 1962, с. 144; А. Краўцэвіч, *Працэс балта-славянскіх кантактаў...*, с. 9.

[4] С. Піваварчык, Г. Семянчук, *Археалогія Беларусі. У 2-х частках. Ч. 2 — Эпоха сярэднявечча*, Гродна 1997, с. 15-16.

[5] В. В. Седов, *Исследования в Гродненском Понеманье*, „Археологические открытия 1968", Москва 1969, с. 346-347.

раўская культуры). З V ст. да н.э. з'яўляюцца помнікі заходніх балтаў (могільнікі тыпу Начы, якія трансфармаваліся ў культуру каменных курганоў V-XIII ст.ст.). Славяне прыйшлі на Беларусь (Заходняе Палессе) толькі ў VI-VII ст.ст. (пражская культура). Рассяленне славян у Цэнтральнай, Паўночнай і Усходняй Беларусі адбылося не раней за IX ст. (культура тыпу Лукі-Райкавецкай, раменская культура ў Пасожжы)[6]. Незразумела, якія паселішчы з раннеславянскімі матэрыяламі на Панямонні мела на ўвазе Ф. Гурэвіч, бо на той час (пачатак 60-х гг.) такіх помнікаў яшчэ не было вядома. Адсюль, напэўна, і такое расплывістае дatаванне — другая палова I тысячагоддзя н.э. На сённяшні дзень толькі на двух панямонскіх помніках зафіксаваны славянскія матэрыялы канца I тысячагоддзя н.э.

Першы помнік — гарадзішча каля в. Радагошча ў Навагрудскім раёне. На думку В. Ніканава, назвы на „гошча" паказваюць на месца, дзе славяне засталі лес. В. Сядоў, параўноўваючы тапонім з археалагічнай картай, прыйшоў да высновы, што назва Радагошча адносіцца ў асноўным да XI ст.[7] Планіроўка гарадзішча Радагошча блізкая да помнікаў Смаленшчыны і Паўночнай Букавіны, а назва вёскі аднайменна назве знакамітага свяцілішча Радагошча на тэрыторыі племяннога саюзу люцічаў (вялетаў) у палабскіх славян. Э. Зайкоўскі, які праводзіў археалагічныя даследаванні на помніку, адзначыў, што да самай шматлікай катэгорыі знаходак адносяцца фрагменты керамікі, якая характэрная для культуры тыпу Лукі-Райкавецкай і датуецца IX-X ст.ст.[8]

Другі помнік, на якім таксама знойдзены матэрыялы культуры тыпу Лукі-Райкавецкай — гарадзішча каля в. Ласосна-Велька (гміна Кузніца-Беластоцкая) на тэрыторыі Польшчы[9]. Помнік гэты знаходзіцца прыкладна 25-30 км на паўднёвы захад ад Гродна на рацэ Ласосне (Ласасянцы), што ўпадае ў Нёман. Такім чынам, абодва гарадзішчы — самыя паўночныя помнікі культуры Лукі-Райкавецкай і датаваць з'яўленне славян у Панямонні можна больш дакладна — IX-X ст.ст., г.зн. самы канец I тысячагоддзя н.э. Археалагічных сведчанняў больш ранняга славянскага пранікнення ў басейн Нёмана няма.

6 А. Мядзведзеў, *Насельніцтва Беларусі ў жалезным веку (VIII ст. да н.э. — VIII ст. н.э.)*, „Беларускі гістарчны агляд" 1994, т. 1, сш. 1, с. 36-37.

7 В. В. Седов, *Из истории восточнославянского расселения*, КСИА, вып. 104, 1965, с. 7; В. А. Никонов, *IV Международный съезд славистов. Материалы дискуссии*, т. 2, Москва 1962, с. 450-451.

8 Э. М. Зайкоўскі, *Раскопкі каля Радагошчы*, „ГАЗ", № 7, с. 120-137.

9 Даклад Я. Машчынскага на канферэнцыі „Problemy konserwatorskie związane z ochroną zabytków archeologicznych w dobie rozwoju ekonomicznego Europy Środkowej i Wschodniej", 18-19 maja 1998, Bielsk Podlaski.

Актывізацыя славянскай каланізацыі на Панямонні, як слушна адзначае А. Краўцэвіч, пачынаецца з канца X — пачатку XI ст.ст. Л. Дучыц сцвярджае, што менавіта ў пачатку II тысячагоддзя адбываўся асабліва інтэнсіўны працэс змешвання балтаў і славян на тэрыторыі Беларусі[10]. Тады не толькі фармаваўся новы антрапалагічны тып, але і ствараўся сінтэз двух архетыпаў свядомасці. На такой базе і з'явіўся беларускі этнас. Гэта быў час, калі вакол таксама пачыналася складванне народнасцей — палякаў, чэхаў, балгараў, украінцаў, літоўцаў і іншых.

Не меньш актуальнае пытанне племяннной дыферынцыяцыі (якія славянскія і балцкія плямёны ўзаемадзейнічалі на Панямонні на пачатку II тысячагоддзя н.э.), бо з ім звязана праблема балцка-славянскай мяжы.

Этнічны склад насельніцтва той ці іншай тэрыторыі вызначыць па археалагічных матэрыялах даволі складана. У апошні час з'явіўся шэраг прац, у якіх вырашаюцца этнагенетычныя пытанні[11]. Вырашэнне гэтых пытанняў залежыць як ад характару помнікаў, так і ад забяспечанасці іх матэрыяламі. У асноўным этнічныя працэсы разглядаюцца археолагамі на матэрыялах пахавальных помнікаў. Дзякуючы вялікаму факталагічнаму матэрыялу, які назапашаны за працяглыя гады палявых даследаванняў, археолагі прыйшлі да высновы, што асноўнымі этнавызначальнымі прадметамі на пахавальных помніках з'яўляюцца жаночыя ўпрыгожанні, пераважна скроневыя кольцы. Істотным крытэрыем пры вызначэнні этнасу па пахавальных помніках з'яўляецца дэтальнае вывучэнне пахавальнага абраду (спосаб пахавання, арыентацыя касцяка, характар і спосаб размяшчэння пахавальнага інвентару). На нашу думку, больш абгрунтаванымі будуць высновы, калі адначасова разглядаць матэрыялы, атрыманыя як з пахавальных помнікаў, так і з паселішчаў вызначанага рэгіёна. Тут павінны ўлічвацца розныя элементы матэрыяльнай культуры насельніцтва — домабудаўніцтва, керамічны комплекс, упрыгожанні.

Па праблеме этнічнага складу насельніцтва ранняга сярэднявечча (X-XIII ст.ст.) у Беларускім Панямонні існуе некалькі поглядаў. Большасць даследчыкаў асноўным насельніцтвам называе дрыгавічоў[12]. В. В. Сядоў лічыць, што тут жылі яцвягі і іх славянізаваныя

10 Л. Дучыц, *Балты і славяне...*, с. 15-30.

11 В. В. Седов, *Восточные славяне в 6-13 вв.*, „Археология СССР", Москва 1982; А. П. Моця, *Население Среднего Поднепровья 9-13 вв. (по данным погребальных памятников)*, Киев 1987; П. Ф. Лысенко, *Дреговичи*, Минск 1991; Г. В. Штыхаў, *Крывічы*, Мінск 1993.

12 Ф. Д. Гуревич, *Древности...*, с. 136; П. Ф. Лысенко, *Дреговичи*, с. 99-100.

нашчадкі[13]. Аналіз матэрыялаў з археалагічных помнікаў Панямоння паказвае, што насельніцтва рэгіёна ў X-XIII ст.ст. было даволі стракатым. Складана выдзеліць які-небудзь раён, дзе пераважала б адзінае ў этнічным плане насельніцтва. Славянскія плямёны, што прыйшлі сюды на пачатку II тысячагоддзя, пражывалі ў цесным кантакце паміж сабой і з аўтахтонным насельніцтвам — балтамі. Адбываўся працэс узаемаўплыву духоўнай і матэрыяльнай культуры рознаэтнічных плямён.

Аналіз курганных старажытнасцей у раёне Навагрудка (вёскі Гарадзілаўка, Мольнічы, Сялец, Суляцічы і іншыя) паказвае, што па абрадзе пахавання і інвентару найбольш яскрава выступаюць пахаванні дрыгавічоў і драўлянаў, не зусім выразна — пахаванні валынянаў. Гэта найбольш раннія славянскія пахаванні ў рэгіёне і датуюцца яны другой паловай X — пачаткам XI ст.ст. Прыкладна тую ж сітуацыю паказваюць антрапалагічныя даныя па матэрыялах могільніка каля в. Брацянка[14]. Сярод могільнікаў XII-XIII ст.ст. найбольш яскрава і ў вялікай колькасці выступаюць пахаванні валынянаў (Суляцічы) і носьбітаў культуры каменных курганоў Бужска-Нёманскага міжрэчча (Батароўка)[15]. Матэрыялы курганоў сінхронны раннім матэрыялам Навагрудка, а кераміка пахавальных помнікаў аналагічна кераміцы гарадзішчаў Радагошча, Сёгда, селішча Пурневічы. Магчыма, гэтыя паселішчы ў адных выпадках засноўваліся, а ў іншых — выкарыстоўваліся паўторна дрыгавічамі ці валынянамі. Паўднёвыя традыцыі (паўзямлянкі і глінабітныя печы) прасочаны ў домабудаўніцтве Навагрудка на ранніх этапах яго існавання і на селішчы Гарадзілаўка[16]. У керамічным комплексе Навагрудка таксама назіраюцца валынскія аналагі[17].

Рухаючыся далей на захад, можна адзначыць, што паміж рэкамі Молчаддзю і Шчарай большасць археалагічных помнікаў належыць славянам. П. Ф. Лысенка ў курганах каля в. Орлавічы знайшоў буйназярнёныя пацеркі — характэрныя дрыгавіцкія ўпрыгожанні[18]. Матэрыялы раскопак Слоніма (Замчышча) і гарадзішча на Косаўскім тракце паказалі іх прыналежнасць на пачатку II тысячагоддзя славянскаму насельніцтву. На гарадзішчы Збочна знойдзены ўпрыгожанні, якія належалі як славянскаму, так і балцкаму на-

13 В. В. Седов, *Восточные...*, с. 120.

14 К. В. Павлова, *Погребальные памятники окрестностей Новогрудка*, „КСИА” 1981, вып. 166, с. 83.

15 К. В. Павлова, *Погребальные...*, с. 83.

16 Ф. Д. Гуревич, *Древности...*, с. 38.

17 М. В. Малевская, *Некоторые исторические связи Новогрудка в 10 в. (по материалам керамики)*, „КСИА” 1972, вып. 129, с. 17.

18 П. Ф. Лысенко, *Дреговичи*, с. 95.

сельніцтву. На гарадзішчы Мерачоўшчына (каля г. Косава) зафіксаваны рэшткі паўзямлянкі і тыпова славянская кераміка X-XI ст.ст. Рысы, характэрныя для валынян, прасочваюцца ў старажытных слаях Ваўкавыска ў выглядзе рэштак паўзямлянак і валынскай керамікі. Тыпова славянская кераміка знойдзена і на гарадзішчы Мсцібава. Трэба ўлічыць і распаўсюджаныя ў могільніках левабярэжнага Панямоння такія ўпрыгожанні, як пярсцёнкападобныя і паўтарааабаротныя скроневыя кольцы. Яны, не будучы спецыфічнымі дрыгавіцкімі ўпрыгожаннямі, характэрныя для паўднёва-заходняй групы ўсходнеславянскіх плямёнаў і не сустракаюцца ў крывічоў і славенаў[19].

Аднак крывічы прымалі ўдзел у каланізацыі Панямоння. Даследчык В. В. Сядоў лічыў, што крывічы засялілі Панямонне даволі рана, пра што сведчаць доўгія курганы. Некаторыя гісторыкі дапушчалі, што палачанамі былі заснаваны панямонскія гарады. Больш познія даследаванні могільнікаў з доўгімі курганамі выявілі, што за доўгія курганы былі прыняты дзюны натуральнага паходжання. Таму роля крывічоў у каланізацыі Панямоння, якую раней лічылі вельмі значнай, сёння ўяўляецца больш сціплай[20].

Асноўная каланізацыйная хваля крывічоў прыйшлася на правабярэжнае Панямонне, у вярхоўі рэк Віліі і Бярэзіны. Пра гэта сведчыць узнікненне тут апорных пунктаў крывічоў — Крэва, Лоска, Палачан, Гарадка, Славенска. Праўда, у гэты час яны перайшлі і на левы бераг, дзе зафіксаваны аднайменныя тапонімы ў Іўеўскім, Слонімскім і Зэльвенскім раёнах. Знаходкі крывіцкіх бранзалетападобных скроневых кольцаў у Панямонні рэдкія. Адзінкавыя пахаванні крывічоў сустракаюцца ў могільніках каля вёсак Сялец, Гарадзілаўка, Брацянка, што пад Навагрудкам[21].

Што да Гродна і ўвогуле заходняй часткі даследуемага рэгіёна, цяжка па археалагічным матэрыяле вызначыць, які этнічны элемент тут пераважаў. Аналіз матэрыяльнай культуры Гродна паказаў славянскі воблік гэтага горада з перавагай рысаў, характэрных для паўднёва-заходняй групы славян. Неабходна звярнуць увагу на заходнеславянскія элементы ў кераміцы Гродна, Турэйска, Індуры. Раскопкі могільнікаў каля вёсак Падрось, Ясудава, Мігова выявілі іх прыналежнасць да змешанага дрыгавіцка-мазавецкага і мазавецка-балцкага насельніцтва.

Складаней вызначыць этнічны склад насельніцтва правага берага Нёмана, паколькі тут не так добра вывучаны археалагічныя пом-

[19] К. В. Павлова, *Погребальные...*, с. 82-83.
[20] В. В. Седов, *Исследования...*, с. 346-347.
[21] К. В. Павлова, *Погребальные...*, с. 82-83.

нікі і ў першую чаргу могільнікі. Ф. Д. Гурэвіч меркавала, што правы бераг Нёмана паміж Бярэзінай і Лебядой быў заняты славянскім насельніцтвам. Вышэй адзначалася, што крывічы прасунуліся ў вярхоўі Віліі і Бярэзіны. На нашу думку, на правы бераг Нёмана перайшлі таксама славяне паўднёвай каланізацыйнай хвалі. Пераход гэты ажыццяўляўся ў двух накірунках. Першы — паміж Гаўяй і Дзітвой, дзе славянская кераміка X-XI ст.ст. зафіксавана на гарадзішчах і селішчах Мыта, Ольжава, селішчах Дакудава, Моцевічы. Інфільтрацыя сюды славян адбывалася з раёна Навагрудка, які знаходзіўся непадалёку, праз Нёман. Другі накірунак — з раёна Слоніма па Шчары ў басейн Лебяды і Котры. Менавіта тут знаходзяцца найбольш значныя помнікі-гарадзішчы Турэйск, Кульбачына, Касцянёва, селішчы Орля, Перакоп. Керамічны комплекс даследаваных гарадзішчаў мае больш падабенства з керамікай паўднёвых зямель (Галіччына, Валынь, Палессе). На гарадзішчы Касцянёва зафіксаваны рэшткі паўзямлянкі, што таксама характэрна для поўдня. Таксама неабходна ўказаць і на заходнеславянскія (мазавецкія) элементы ў кераміцы гэтых помнікаў (вертыкальнае горла, штампы, налепнае рабро, форма посуду). На гарадзішчах Кульбачына і Касцянёва адзначаны і балцкія элементы — умацаванне вала валунамі і каменныя агнішчы. У гэтым рэгіёне знаходзіцца значная колькасць каменных могільнікаў, якія адносяцца да балцкіх, верагодна, яцвяжскіх[22].

На думку даследчыкаў, стабільнай мяжы паміж славянамі і балтамі не было. Не было яе, калі пачыналася каланізацыя славянамі балцкіх зямель, не было і пазней, калі каланізацыя гэтых зямель ішла поўным ходам. Такім чынам, аналіз матэрыялаў з археалагічных помнікаў Беларускага Панямоння паказвае, што засяленне рэгіёна славянскім насельніцтвам адбывалася з двух накірункаў — паўднёвага (дрыгавічы, валыняне) і паўночна-ўсходняга (крывічы). Наяўнасць у рэгіёне храналагічна розных груп могільнікаў дазваляе гаварыць пра дзве хвалі славянскай каланізацыіі Панямоння. Першая хваля накіравалася сюды ў другой палове X — XI ст., што пацвярджаецца раскопкамі гарадзішчаў, дзе на ранніх стадыях існавання прасочваюцца паўднёвыя традыцыі ў домабудаўніцтве і адзначаецца падабенства керамічных комплексаў з помнікамі паўднёва-заходняй групы славян. У XII ст. назіраецца новы прыток насельніцтва з поўдня, што звязана з узмацненнем Галіцка-Валынскага княства. Адначасова з гэтым працэсам адбывалася інфільтрацыя ў Панямонне крывічоў і заходнеславянскага насельніцтва (мазаў-

22 А. В. Квяткоўская, *Даследаванні каменнага могільніка каля вёскі Вензаўшчына Шчучынскага раёна*, „Гарадзенскія запісы”, Гродна 1993, вып. 16, с. 34.

шан). Мы згодны з А. Краўцэвічам, што акрэсленне нават прыблізнай лінеарнай мяжы выглядае справай складанай. Фактычна яе не існавала і цалкам правамерна гаварыць аб кантактнай зоне, якой было ўсё Беларускае Панямонне. Аб тым, што на пачатку II тысячагоддзя этнічныя кантакты балтаў і славян былі разнастайныя і рассеяныя, а не пагранічныя, пацвярджаюць і даныя сумежных навук — антрапалогіі, тапаніміі, гідраніміі, мовазнаўства, этналогіі і іншых. Так, антраполагі адзначаюць, што спецыфічны комплекс краніялагічных прыкметаў некалькі паслабленай еўрапеаіднасці з эпохі сярэднявечча ў амаль нязменным выглядзе захаваўся сярод усходнеславянскага насельніцтва толькі на тэрыторыі Беларусі. Гэты факт сведчыць пра значную ролю старажытнага мясцовага (неславянскага) насельніцтва ў фармаванні антрапалагічнага тыпу беларусаў. На карысць гэтай высновы сведчыць амаль поўная нязменнасць скулавай шырыні і вышыні твару на працягу апошняга тысячагоддзя, што дазваляе аддаць перавагу ў фармаванні антрапалагічнага тыпу беларусаў шырока- і нізкатварым элементам, паходжанне якіх звязана з Прыбалтыкай[23].

Гаворачы пра этнасы ў басейне Нёмана, неабходна ўказаць і на археалагічныя матэрыялы, якія могуць папоўніць этнічную карту рэгіёна. Падчас раскопак на гарадзішчы Кульбачына намі знойдзены ланцэтападобныя наканечнікі дзідаў і стрэлаў. Дадзеныя тыпы зброі былі распаўсюджаны ў Скандынавіі ў часы вікінгаў[24]. З Панямоння паходзяць і іншыя скандынаўскія знаходкі — шлем са Слоніма, перакрыжаванне мяча з Гродна, упрыгожанні і шпора з Ваўкавыска, падвеска з Гальшан. Аб магчымым варыянце з'яўлення скандынаваў на Панямонні мы пісалі раней, таму не будзем на гэтым спыняцца[25]. Адзначым яшчэ адну цікавую знаходку, якая пераводзіць гіпатэтычныя меркаванні некаторых даследчыкаў аб фіна-ўгорскім кампаненце ў этнагенезе беларусаў у рэальную плоскасць. Падчас раскопак на гарадзішчы Збочна пад Слонімам (даследаванні А. Дабрыяна і нашы) была знойдзена падвеска, якая характэрная для фіна-ўгорскіх плямёнаў — меры, весі, мардвы. Думаецца, што далейшыя археалагічныя даследаванні прынясуць новыя знаходкі як скандынаўскага, так і фіна-ўгорскага паходжання.

[23] Л. Дучыц, *Балты і славяне...*, с. 27.

[24] Д. А. Авдусин, *О датировке гнёздовского кургана с мечом из раскопок М. Ф. Кусцинского*, „Культура и искусство древней Руси", Ленинград 1957, с. 22-23.

[25] С. Піваварчык, *Беларускае Панямонне ў ранім сярэднявеччы (X-XIII ст.ст.)*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne" 1996, nr 6, s. 19-21.

Што выклікае наша пярэчанне пры разглядзе кантактнай зоны — гэта колькасць гарадоў. А. Краўцэвіч налічыў іх 8 — Гродна, Ваўкавыск, Навагрудак, Слонім, Здзітаў, Астрэя, Вевярэск, Вільня. Але ж ці адпавядалі гэтыя паселішчы на пачатку II тысячагоддзя той сацыяльна-гістарычнай функцыі, якую выконваў горад — цэнтр палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця рэгіёна?

У выніку шматгадовых даследаванняў беларускіх гарадоў даследчыкі вылучылі асноўныя сацыяльна-эканамічныя крытэрыі і архітэктурна-археалагічныя прыкметы горада. Да першых адносяцца: узгадванне аб ім у пісьмовых крыніцах як аб важным населеным пункце, цэнтры вызначанай акругі; наяўнасць дзядзінца („града”) і пасада, плошча якога значна пераважала плошчу дзядзінца; наяўнасць значнай часткі насельніцтва, якая займалася гандлёва-рамеснай дзейнасцю і была адарвана ад земляробства; існванне гарадской абшчыны.

Архітэктурна-археалагічныя прыкметы горада: спецыфічны (гарадскі) культурны пласт, у якім утрымліваецца вялікая колькасць шкляных бранзалетаў, прывазных амфар, сланцавых прасліц і іншых характэрных вырабаў — пісал, энкалпіёнаў, упрыгожанняў і г.д.; другая лінія ўмацаванняў; манументальныя культавыя пабудовы; устойлівая тэндэнцыя павелічэння плошчы дзядзінца ці пасада. Усім вышэйназваным крытэрыям на Панямонні адпавядалі 5 паселішчаў — Горадзен (Гродна), Новагародак (Навагрудак), Ваўкавыеск (Ваўкавыск), Услонім (Слонім), Турьск (Турэйск). Аб тым, што ў святле апошніх археалагічных даследаванняў трэба адмовіцца ад лакалізацыі Астрэі і Вевярэска ў Панямонні (і ўвогуле на Беларусі) мы пісалі раней[26]. Здзітаў увогуле не трапляе у кантактную зону (гэта вынікае з прапанаванай А. Краўцэвічам карты)[27]. Ды ўвогуле, што ўяўляла сабой гэтае паселішча да сярэдзіны XIII ст. (узгадванне ў пісьмовых крыніцах) невядома, паколькі амаль не вывучалася. Як і невядома пакуль дакладна, калі ўзнікла паселішча на віленскім Верхнім замку і якія функцыі выконвала.

Унікальнасць Беларускага Панямоння якраз і заключаецца ў тым, што нягледзячы на невялікую колькасць гарадоў, у XII-XIII ст.ст. рэгіён дасягнуў высокага эканамічнага і культурнага развіцця. Тлумачыць гэту з’яву балта-славянскім супрацоўніцтвам недастаткова. Паўплывала зручнае геаграфічнае становішча, уцягванне насельніцтва ў палітычныя працэсы ва Усходняй Еўропе і феадалізацыя грамадства.

[26] С. Піваварчык, *Беларускае...*, с. 18-19; ён жа, *Археалогія і нумізматыка Беларусі*, „БЭН”, 1993.

[27] А. Краўцэвіч, *Працэс...*, с. 8.

Археалагічныя матэрыялы дапамагаюць разабрацца і з характарам міжэтнічных узаемаадносін. У сваім артыкуле А. Краўцэвіч адзначае, што маглі мець месца канфлікты прышэльцаў з тубыльцамі, асабліва на ранняй стадыі кантактаў, але асновай балта-славянскага ўзаемадзеяння было мірнае супрацоўніцтва. Пры гэтым ён спасылаецца на высновы лінгвістаў і К. Паўлавай, якая даследавала курганныя могільнікі ў наваколлі Навагрудка[28]. На наш погляд, найбольш канцэнтраваную інфармацыю пра характар як міжэтнічных, так і міждзяржаўных адносін могуць даць даследаванні паселішчаў.

На Панямонні найбольш даследаваны гарады (Гродна, Ваўкавыск, Навагрудак, Слонім, Турэйск) і гарадзішчы, якія выконвалі розную сацыяльна-гістарычную функцыю. З неўмацаваных паселішчаў (селішчаў) пачатку ІІ тысячагоддзя н.э. стацыянарныя раскопкі праводзіліся толькі на чатырох помніках — Гарадзілаўка (Навагрудскі р-н), Кавалі (Слонімскі р-н), п. Краснасельскі (Ваўкавыскі р-н), Пескі (Мастоўскі р-н). На большасці даследаваных помнікаў зафіксаваны сляды пажараў. На селішчы Кавалі знойдзены часткі абгарэлага насцілу памерамі 1,8 х 1 м. Пласт попелу і вугалляў адзначаны на селішчы Гарадзілаўка[29]. Згарэлі ў агні раннія паселішчы на Замкавай гары ў Гродне і Малым Замку ў Навагрудку[30]. Неабходна заўважыць, што пажары адбыліся ў хуткім часе пасля заснавання паселішчаў у канцы Х — сярэдзіне ХІ ст.ст. Праз кароткі час пасля ўзнікнення ў другой палове ХІ ст. загінула ў агні пасяленне Турэйск на Нёмане[31]. Пласты пажару з моцна абгарэлай керамікай, спаленымі ўмацаваннямі і пабудовамі зафіксаваны намі на гарадзішчах Мерачоўшчына (Івацэвіцкі р-н), Кульбачына, Касцянёва (Шчучынскі р-н), Косаўскі тракт (пад Слонімам), Кашалі (Зэльвенскі р-н). У ХІ-ХІІ ст.ст. згарэлі гарадзішчы каля вёсак Ласосна-Велька (гміна Кузніца-Беластоцкая, Рэспубліка Польшча) і Плёткі (Шчучынскі р-н)[32]. Пра што сведчаць гэтыя факты? Аб выпадковых пажарах на паселішчах, ці аб канфліктах? Думаецца, што аб другім. Той факт, што большасць пажараў зафіксаваны ў пластах ХІ-ХІІ ст.ст., наводзіць на думку, што балцкія плямёны, якія ўступілі ў перыяд ваеннай дэмакратыі, сустрэлі новае насельніцтва ваяўніча.

[28] А. Краўцэвіч, *Працэс...*, с. 22.

[29] Ф. Д. Гуревич, *Древности...*, с. 153; Ф. Д. Гуревич, *К истории древнего Новогрудка*, „Światowit”, t. XXIV, Warszawa 1962, s. 569.

[30] Н. Н. Воронин, *Древнее Гродно*, „МИА”, 1954, с. 27, 29; Ф. Д. Гуревич, *Древний Новогрудок. Посад — окольный город*, Ленинград 1981, с. 116-117.

[31] Я. Г. Зверуго, *Верхнее Понеманье в IX-XIII вв.*, Минск 1989, с. 89.

[32] Матэрыялы аўтарскіх раскопак, з даклада Я. Машчынскага на канферэнцыі, вуснае паведамленне А. Квяткоўскай.

Па нашаму меркаванню, характар міжэтнічных узаемаадносін на Панямонні на пачатку II тысячагоддзя н.э. можа выглядаць наступным чынам. Першыя сутыкненні балтаў і славян мелі канфрантацыйны характар. Аб гэтым сведчаць шматлікія пажары на паселішчах. Менавіта варожае атачэнне паспрыяла таму, што ў сярэдзіне XI — першай палове XII ст.ст. найбольш буйныя цэнтры славянскай каланізацыі ў рэгіёне набылі тыповую гарадскую планіроўку (дзядзінец, вакольны горад, пасады). З сярэдзіны XII ст. узаемаадносіны сталі пераважна мірнымі. Прычыны гэтага бачацца нам ва ўзмацненні палітычнай улады ўсходнеславянскіх князёў, паглыблення феадальных адносін. Стала відавочна, што мірнае супрацоўніцтва больш карыснае для ўсіх бакоў. У другой палове XII — першай палове XIII ст.ст. панямонскія гарады перажываюць эканамічны і культурны ўздым, ператвараюцца ў адмінстрацыйныя, эканамічныя, ваенныя, культурныя і ідэалагічныя цэнтры рэгіёна.

Беларускае Панямонне — унікальны гістарычна-этнаграфічны рэгіён. Разам з Беласточчынай яно ўтварае бірэгіянальнае памежжа, дзе адбываецца творчы сінтэз, нараджаюцца з'явы, якія можна назваць супольнай спадчынай двух або трох народаў. Здаецца, гісторыкі (і не толькі яны) будуць яшчэ не аднойчы звяртацца да працэсаў, якія адбываліся тут у розныя часы. Безумоўна, вырашаць складаныя пытанні этнагенетычнага і дзяржаўнаўтваральнага працэсаў у раннім сярэднявеччы толькі на падставе археалагічных крыніц было б метадалагічнай памылкай. Таму каштоўнасць высноў А. Краўцэвіча заключаецца ў тым, што ён прааналізаваў і іншыя крыніцы, і ў першую чаргу лінгвістычныя. Мы ж са свайго боку паспрабавалі ўказаць на тое, што можа дапамагчы ў больш аб'ектыўным асвятленні складанай этнічнай і палітычнай гісторыі Беларусі.

**Сяргей Піваварчык**
(Гродна)

## Анатоль Цітоў, *Геральдыка беларускіх местаў (XVI — пачатак XX ст.)*, Мінск 1998, сс. 287

У беларускай гістарычнай навуцы знойдзецца няшмат даследаванняў, прысвечаных праблемам геральдыкі. А гарадскімі гербамі, увогуле, прафесійна займаецца толькі адзін аўтар — Анатоль Цітоў[1]. Дзякуючы яго шматгадовым росшукам па архівах Белару-

[1] Гл.: А. Цітоў, *Гарадская геральдыка Беларусі*, Мінск 1989; ён жа, *Беларуская гарадская геральдыка*, [у:] *Помнікі старажытнабеларускай культуры*, Мінск 1984.

сі, Літвы, Польшчы, Расеі, мы можам сабе ўявіць візітныя карткі (менавіта гэткую функцыю выконваў герб) большасці беларускіх гарадоў перыяду сярэднявечча і новых часоў. Рэцэнзуемая кніга — своеасаблівае падсумаванне даволі значнага перыяду вывучэння беларускай гарадской геральдыкі, і ў гэтым яе вялікае значэнне.

Апошняе даследаванне Анатоля Цітова складаецца з дзвюх самастойных частак. Першая — навуковая, у якой разглядаюцца пытанні ўзнікнення беларускай гарадской („мескай”, па тэрміналогіі аўтара кнігі) геральдыкі, асноўныя этапы яе развіцця і класіфікацыя сімвалічных выяваў на гербах. Другая частка — інфармацыйная, у ёй прыведзены рэканструяваныя аўтарам каляровыя выявы гербаў гарадоў і мястэчак беларускіх земляў, якія атрымалі магдэбургскае права і права на валоданне гэтым рэпрэзентатыўным элементам сваёй вольнасці. Вартасць гэтай часткі яшчэ ў тым, што у ёй пададзена інфармацыя нават аб тых гарадах, для якія гербы былі толькі спраектаваны (Кузніца-Беластоцкая, Мельнік, Саколка, Свянцяны, Янаў і іншыя).

Да кожнага населенага пункта прыведзена кароткая гістарычная інфармацыя энцыклапедычнага характару. На нашу думку, гэты матэрыял у кнізе можа выклікаць найбольш нараканняў і дробных заўваг. Часам адчуваецца, што розныя гарады характарызуюцца па розных схемах. Напрыклад, на старонцы 129 аўтар, гаворачы пра Ваўкавыск, 2/3 тэксту адводзіць гістарычным звесткам з XIX — пачатку XX ст.ст., а не ранейшым стагоддзям. А на старонках 184-185, гаворачы пра Ліду, прытрымліваецца адваротнага прынцыпу. Дарэчы, другі падыход нам бачыцца больш правільным.

Канчаецца кніга цікавымі дадатковымі матэрыяламі ў выглядзе здымкаў гербаў, іх праектаў і пячатак беларускіх гарадоў, зробленых з архіўных і музейных фондаў пераважна Расіі і Беларусі. Карыснымі для чытача будуць паказальнік геральдычных сюжэтаў „мескіх” гербаў і геаграфічны паказальнік.

Варты ўвагі ў кнізе Анатоля Цітова метадалагічны падыход да вызначэння тэрытарыяльных межаў даследавання. Здаецца, гэта першая спроба разглядаць нашую гісторыю не ў межах сучаснай Рэспублікі Беларусь, а ў межах рассялення беларускага народу, г.зн. аўтар выкарыстоўвае матэрыял з Падляшша, Смаленшчыны, Пскоўшчыны, Віленшчыны. Такі падыход робіць высновы любой гістарычнай працы больш грунтоўнымі. Праўда, на нашу думку, у некаторых выпадках аўтар перабольшвае. Напрыклад, такія населеныя пункты, як Астралэнка, Візуны, Кольна, Ломжа, Новы Грод, Прэросль, Сувалкі, Цехановец, Філіпаў на захад ад беларускага арэала; Мейшагола, Трокі на паўночны захад альбо Нова-

зыбкаў, Новае Места, Пагар і Мглін на ўсход цяжка акрэсліць як гарады („месты”) беларускія. Факт знаходжання ў складзе Вялікага княства Літоўскага ці нават заснавання вялікімі князямі альбо беларуска-літоўскай магнатэрыяй не дазваляюць прыпісваць гэтым населеным пунктам беларускі нацыянальны характар. Падобны „беларускі імперыялізм” аўтара магчыма растлумачыць жаданнем выкарыстаць максімальна наяўны факталагічны матэрыял арыгінальнага зместу. За гэта польскія і расейскія даследчыкі і спецыялісты будуць вельмі ўдзячныя А. Цітову.

